**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2022 г.**

## **Мерапрыемствы да Года гістарычнай памяці**
## **Мерапрыемствы да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны**

У чэрвені прайшоў бібліямарафон патрыятычных мерапрыемстваў «Слаўнай гісторыі галоўныя даты».

**8 чэрвеня**

У рамках Года гістарычнай памяці для вучняў СШ № 6 г. Кобрына, выхаванцаў летняга лагера працы і адпачынку, прайшла інфармацыйная гадзіна «У сімвалах - гісторыя малой радзімы». Старшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна Р. І. Гушчын расказаў пра значэнне дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь як найважнейшых атрыбутаў суверэнітэту і незалежнасці Айчыны. У ходзе мерапрыемства была прадстаўлена слайд-прэзентацыя «Сімвалы малой радзімы». Вучні адказвалі на пытанні віктарыны «Як мы ведаем сімволіку Кобрыншчыны?».

ЦБ, 21 чал.

**9 чэрвеня**

Да 140-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы ў бібліятэцы прайшла гадзіна літаратурнага партрэта «Звіні, спявай, Купалаўская ліра!». Навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа пазнаёміліся з шляхам жыцця і творчасці Янкі Купалы, дакрануліся да залацінак і россыпаў яго твораў, адчулі асалоду роднага слова. Напрыканцы мерапрыемства прайшла віктарына «Янка Купала. Жыццё і творчасць».

ЦБ, 25 чал.

**18 чэрвеня**

У рамках свята в. Лука, прысвечанага 125-годдзю першага ўпамінання вёскі ў гістарычных дакументах, бібліятэкар правяла бенефіс чытаючых сем’яў «История семьи в истории села». Дыпломамі ў розных намінацыях узнагароджаны лепшыя чытачы бібліятэкі. Да мерапрыемства аформлена фотавыстава «Тут Радзімы маёй пачатак».

Лукская ПБ, 28 чал.

**18 чэрвеня**

Для вучняў Гарадзецкага дзіцячага сада-СШ, выхаванцаў летняга лагера працы і адпачынку, у бібліятэцы прайшла тэматычная гадзіна «Нам этой даты не забыть». Бібліятэкар расказала дзецям пра самыя буйныя бітвы напачатку вайны: бітве пад Масквой, Сталінградскай і Курскай бітвах, пра партызанскія атрады, фронт, пра зусім юных воінаў. Дзеці адказвалі на

пытанні віктарыны «Великая Отечественная война в памяти людской», пазнаёміліся з кніжнай выставай «Мы помним ночь войны». У завяршэнне дзеці выканалі песню «О той весне…».

Гарадзецкая ПБ,20 чал.

**19 чэрвеня**

У рамках Года гістарычнай памяці працаўнікі бібліятэкі і сельскага клуба правялі гістарычны марафон «Пусть будет мирным небо над землей, пусть детство звонкое смеется!». Юныя госці мерапрыемства праслухалі расказ бібліятэкара пра трагічныя падзеі тых гадоў, пазнаёміліся з кніжнай выставай «И помнить страшно, и забыть нельзя!», удзельнічалі ў аўкцыёне «Города-Герои», конкурсе «Алфавит Победы», гульні «Военная техника».

Кіселявецкая ПБ, 25 чал.

**21 чэрвеня**

У бібліятэцы прайшла фальклорна-этнаграфічная гадзіна «Датуль завёмся мы народам, пакуль шануем карані». Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы старэйшых класаў лагера працы і адпачынку СШ №6 г. Кобрына. Прысутныя пазнаёміліся з народнымі святамі беларускага календара: «Дзяды», «Масленіца», «Сарокі», «Камаедзіца», «Юр’еў дзень», з нацыянальнай кухняй беларусаў, з традыцыйным народным беларускім адзеннем. Завяршылася мерапрыемства віктарынай «Сцежкамі роднай зямлі».

ЦБ, 21 чал.

**22 чэрвеня**

У бібліятэцы адбылася літаратурна-паэтычная гадзіна «Стихи, рожденные войной» для навучэнцаў Батчынскай сярэдняй школы. Бібліятэкар расказала пра нялёгкі лёс франтавых паэтаў: К. Сіманава, Ю. Друнінай, О. Бергольц, А. Твардоўскага, чые вершы з’явіліся ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці прачыталі вершы К. Сіманава «Жди меня», П. Панчанка «Сінія касачы», П. Броўкі «Тры браты», слухалі песні ваенных гадоў «Священная война», «В землянке», «Катюша».

Батчынская ПБ, 12 чал.

**22 чэрвеня**

У рамках Года гістарычнай памяці і маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» на літаратурна-музычны вечар «Тревожный рассвет 41-го» сабраліся навучэнцы старэйшых класаў лагера працы і адпачынку СШ №6 і №4 г. Кобрына. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны, прывялі фактычныя даныя пра страты, якія панесла наша краіна ў тыя страшныя гады, пазнаёмілі з гісторыяй спаленых вёсак на Кобрыншчыне. Пракурор Кобрынскага раёна, Сяргей Анатольевіч Мяшэчка прэзентаваў кнігу «Геноцид белорусского народа», якая выйшла ў свет пад рэдакцыяй генеральнага пракурора Андрэя Шведа.

ЦБ,53 чал.

**22 чэрвеня**

Супрацоўнікі бібліятэкі і Дома культуры правялі гадзіну гістарычнай памяці «Тревожный рассвет 41-го года». Гучалі вершы і песні вайсковых гадоў. Падчас правядзення агляду кніжнай выставы «Без срока давности» бібліятэкар расказала пра зверствы фашыстаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Хвілінай маўчання прысутныя ўшанавалі загінуўшых і ўсклалі кветкі да помніка землякам.

Верхалеская ПБ, 42 чал.

**23 чэрвеня**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правялі квэст-гульню «По дорогам Великой Отечественной войны» для дзяцей прышкольнага лагера. Дзеці прайшлі маршрутам васьмі станцый: «Госпиталь», «Ни шагу назад», «Снайпер», «Шифровальная», «На привале», «Вместе мы – сила», «Чёрный ящик», «Рисунок», адказалі на пытанні віктарыны «Исторические факты о Великой Отечественной войне», праслухалі агляд кніжнай выставы «В книжной памяти мгновения войны». Мерапрыемства скончылася хвілінай маўчання, ускладаннем кветак у помніка загінуўшым воінам.

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 60 чал.

**24 чэрвеня**

Чарговай формай прафесійнага навучання бібліятэчных супрацоўнікаў публічных бібліятэк раёна стала дыялогавая пляцоўка «Работа публичных библиотек в Год исторической памяти. Изучаем. Применяем». Метадысты правялі аналіз мерапрыемстваў, падрыхтавалі і прадставілі Палажэнне аб раённым конкурсе буклукаў «Книжный натюрморт по имени «Память», прэзентавалі інтэрактыўную краязнаўчую віктарыну «Кобрын: ад мінулага ды сучаснага». Бібліятэкары публічных бібліятэк падзяліліся сваімі ідэямі і напрацоўкамі.

ЦБ, 25 чал.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага дня аховы дзяцей
## Мерапрыемствы ў рамках праекта «Книга, солнце, дружба – вот, что детям нужно!»

**1 чэрвеня**

У Дзень аховы дзяцей у бібліятэцы адбылася гадзіна вясёлых задум «Мир детства – самый лучший мир» для выхаванцаў дзіцячага саду №4, бібліятэку наведалі старэйшыя групы «Чебурашка» і «Красная Шапочка». У пакоі казак іх чакаў сюрпрыз ад лялечнага тэатра «Сказка» – спектакль «Жадная ежиха». Дзеці адказвалі на пытанні лялечнай тэатралізаванай віктарыны «Волшебный мир сказки». Мерапрыемства скончылася дыскатэкай «Двигайся больше!».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 32 чал.

**1 чэрвеня**

У бібліятэцы прайшло завочнае падарожжа «Солнце дарит нам тепло, с книгой жить нам хорошо» для дзяцей 1-4 класаў. На станцыі «Сказочно-загадочной» дзеці адгадвалі загадкі, адказвалі на жартоўныя пытанні. На станцыі «Игровая» дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсах «Повтори наоборот», «Кодовое слово», адказвалі на пытанні займальнай віктарыны «Угадай-ка». На станцыі «Фанты» дзеці па чарзе выцягвалі карткі з заданнямі і выконвалі іх.

Акцябрская ПБ, 18 чал.

**1 чэрвеня**

На гульнявой праграме «Лето красное пришло» дзеці пазнаёміліся з літаратурай для летняга чытання, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні, дапаўнялі прыказкі і прымаўкі пра сяброўства, удзельнічалі ў гульнях «Азбука добрых слов», «Меткий стрелок», «Кенгуру» і інш. Спаборнічалі каманды «Звездочки» і «Солнышки». Скончылася гульнявая праграма малюнкамі мелам на асфальце і салодкім сталом.

Магдалінская ПБ, 29 чал.

**3 чэрвеня**

Да Міжнароднага дня аховы дзяцей бібліятэка і сельскі клуб правялі свята дзяцінства «Под открытым зонтиком добра». Мерапрыемства пачалося з віншавання дзяцей з першым днём лета і працягнулася вясёлымі гульнямі. Падзяліўшыся на дзве каманды, дзеці спаборнічалі ў розных гульнях і эстафетах: «Гусеница», «Самый внимательный», «Перепрыгни через лужу», «Лети, лети самолётик», «Ловкий мяч», «Песни знакомые с детства». Гульні змяняліся нумарамі мастацкай самадзейнасці ў выкананні дзяцей. Пад канец свята ўсе дзеці атрымалі салодкія падарункі ад ААТ «Стригово».

Тэвельская ПБ, 30 чал.

**10 чэрвеня**

Навучэнцы прышкольнага лагера наведалі паэтычны зарапад «Стихи любимой поэтессы – читаем и слушаем», які прайшоў у бібліятэцы. Разам з Надзеяй Момлік дзеці чыталі вершы, абмяркоўвалі прачытанае, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны «Цветочная поляна» і адгадвалі загадкі з кніг. Аўтар пазнаёміла прысутных з макетам будучай кнігі «Учит азбуку ежонок». Мерапрымства суправаджалася прэзентацыяй «Весёлая карусель».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 27 чал.

**10 чэрвеня**

Да Дня нараджэння марожанага бібліятэка запрасіла юных чытачоў на адкрыццё бібліё-кафэ «Сладости для радости». З расказа бібліятэкара дзеці пазналі шмат цікавага пра любімы прадукт: яго гісторыю, яго інгрэдыенты, якія віды марожанага існуюць, пра яго карысць і шкоду. З вялікім азартам дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах і гульнях «Что лежит в холодильнике?», «Кто больше знает названий мороженого?», «Пронеси мороженое», «Шарик мороженого на двоих», разгадвалі тэматычныя загадкі.

Гарадзецкая ПБ, 25 чал.

**15 чэрвеня**

Бібліятэкар для дзяцей прышкольнага лагера «Улыбка» правяла літаратурна-гульнявую праграму «Планета сказок». Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах «Хорошо ли ты знаешь сказки», «Ушки на макушке», «Сказочные ошибки», «Герой и сказка», з радасцю адгадвалі загадкі, чыталі казкі і знаходзілі памылкі, пазнавалі казкі па ілюстрацыях. Хлопчыкі і дзяўчынкі актыўна ўдзельнічалі ў акцыі «Раскрась мир детства», гулялі ў рухомыя і інтэлектуальныя гульні «Взрыв», «Башня», «Кто я?», міні-футбол.

Батчынская ПБ, 32 чал.

**16 чэрвеня**

У гульнявой праграме бібліятэкі «Летние забавы» удзельнічалі дзеці прышкольнага лагера «Патриот». Хлопчыкі і дзяўчынкі гулялі ў вясёлую гульню «Фанты», адказвалі на пытанні віктарыны «Угадай слово», адгадвалі загадкі, спаборнічалі ў кемлівасці, спрыце і хуткасці. Усе ўдзельнікі атрымалі салодкія прызы, закладкі-размалёўкі «Мои безопасные каникулы» і добры настрой.

Кіселявецкая ПБ, 16 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**3 чэрвеня**

Працягнулася бясплатная кансультацыйная дапамога па натарыяльных пытаннях у рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество». Чарговая бясплатная кансультацыя жыхарам горада была аказана натарыусам натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Наталляй Мікалаеўнай Філіпук.

ЦБ, 6 чал.

**9 чэрвеня**

У бібліяэцы прайшло відэападарожжа «Игромания – болезнь века». Бібліятэкар расказала пра Інтэрнэт і пра асноўныя правілы паводзін у сетцы. Дзеці расказалі пра тое, чаму ім падабаюцца камп’ютарныя гульні і як часта яны ў іх гуляюць, паўдзельнічалі ў конкурсе «Шляпа размышлений», склалі сінквейн на слова «Интернет», пазнаёміліся з тэматычнымі артыкуламі з часопіса «Здоровый образ жизни», прагледзелі відэапрэзентацыю «Безопасный Интернет детям».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 25 чал.

**16 чэрвеня**

Актуальны дыялог «Вредные привычки: избавление от зависимостей» прайшоў у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для навучэнцаў старэйшых класаў лагера працы і адпачынку СШ №6 г. Кобрына. Урач-валеолаг Цэнтра, дружалюбнага падлеткам і моладзі «Ориентир» Святлана Філіпеня правяла гутарку аб шкодзе электронных цыгарэт на мозг, псіхіку і органы дыхання падлеткаў, аб уплыве нікацінавых і безнікацінавых вейпаў. Мерапрыемства суправаджалася праглядам прэзентацыі «Опасность вредных привычек».

ЦБ, 21 чал.

## **Выдавецкая дзейнасць**

Да 25-годдзя з часу заснавання ВУП «Брэсцкія традыцыі» (Кобрынскі мясакамбінат) бібліёграфы цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавалі інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Увасабленне густу і якасці» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада».

Зыбайла К. І.
Тэл. 3 85 81